**Лазько Р. Р. (Гомель, УА "ГДУ імя Ф. Скарыны")**

# ЯК ЛАСТОЎСКІ ДАПАМОГ ЧАРВЯКОВУ Ў АДРАДЖЭННІ БССР

"Нас падзялялі – хто? Чужаніцы, цёмных дарог махляры..." Верш Якуба Коласа, які змяшчае гэтыя радкі - адзін са шматлікіх у беларускай літаратуры на тэму рыжскага падзелу Беларусі, - недвухсэнсоўна выражае думку аб тым, што ў выніку польска-савецкай вайны Беларусь была падзеленая аднолькава чужымі ёй суседнімі дзяржавамі. Аднак гісторыкі на працягу доўгага часу вымушаны былі пісаць аб захопе Заходняй Беларусі "буржуазна-памешчыцкай" Польшчай, пакідаючы ў ценю другога ўдзельніка падзелу. У апошнія гады сітуацыя ў гістарыяграфіі гэтай праблемы змянілася да лепшага [27, 31, с. 318], але і яна пакідае яшчэ шмат пытанняў, якія патрабуюць адказу. Першае з іх: які юрыдычны статус меў Ваенна-рэвалюцыйны камітэт БССР, абвешчаны вышэйшым органам улады ў рэспубліцы ў момант яе новага стварэння? А ў сувязі з гэтым, якія ён меў паўнамоцтвы, і якімі кіраваўся матывамі, прымаючы значныя для Беларусі рашэнні? Перш за ўсё, чаму не настойваў на самастойным прадстаўніцтве БССР на польска-савецкіх мірных перагаворах? Калі меркаваць па яго назве, то відавочна, што гэта быў надзвычайны орган, узніклы ў ходзе ваенных дзеянняў. Аднак чаму так зацягнулася яго існаванне ў гэтым статусе, амаль на паўгода? Успомнім, што ад стварэння Мінскага губрэўкома ў канцы 1918 г. да першага з'езда саветаў, які канстытуіраваў Беларускую савецкую рэспубліку (хоць і не надоўга), прайшло крыху больш за паўтара месяцы. Ці звязана такое прамаруджванне толькі з сітуацыяй на фронце? Магчыма, былі іншыя прычыны? Гэта важна высвеціць, бо орган улады, які абапіраецца на выніку выбараў, валодае большай легітымнасцю, чым надзвычайны ваенны орган, і тым самым большымі паўнамоцтвамі для абароны інтарэсаў народа, ад імя якога выступае. А ў Беларусі ў канцы 1920 г. пастаянныя цывільныя органы ўлады былі створаны толькі тады, калі асноўныя падзеі Рыжскай мірнай канферэнцыі, надоўга вызначыўшыя лёс краіны, ужо адбыліся. Нарэшце, неабходна высветліць пытанне аб альтэрнатывах вядомаму і трагічнаму для нашай краіны выніку рыжскіх перагавораў. Калі альтэрнатывы існавалі, то чаму не былі рэалізаваны? Не прэтэндуючы на паўнату і бездакорную дакладнасць адказаў на гэтыя пытанні, спадзяемся, аднак паспрыяць іх больш глыбокаму разуменню ў сучаснай гістарыяграфі.

Так званае другое абвяшчэнне БССР было вынікам рашэння высокай партыйнай інстанцыі – пленума ЦК РКП(б), што з'яўляецца вядомым фактам і прызнаецца ўсімі сучаснымі даследчыкамі. Але канстатацыі факта яшчэ недастаткова для разумення яго сутнасці. Ён мусіць быць разгледжаны ва ўсіх сваіх сувязях, а значыць, і ў сувязі з папярэдняй палітыкай савецкай улады па беларускім пытанні, і ў кантэксце падзей

польска-савецкай вайны і знешняй палітыкі РСФСР у цэлым. Калі з гэтай пазіцыі разглядаць названы факт, то мы прыйдзем да разумення, што рашэнню бальшавіцкага кіраўніцтва аб стварэнні беларускага рэўкама папярэднічаў іншы этап яго палітыкі па беларускім пытанні, на якім яна была падпарадкаваная пошуку новай “мірнай передышкі”. Гэту другую пасля Брэсцкага міру передышку савецкае кіраўніцтва шукала менавіта ў адносінах з Польшчай, праяўляючы гатоўнасць даць за яе вялікую цану – тэрыторыю Беларусі аж да Бярэзіны і Дняпра, гэта значыць, амаль усю тую беларускую тэрыторыю, якая засталася па-за межамі РСФСР пасля абрэзкі ў студзені 1919 г. толькі што абвешчанай “першай” БССР. На працягу 1919 г. адпаведныя прапановы неаднаразова рабіліся ў ходзе сакрэтных перагавораў, якія ад імя савецкага ўрада вёў Ю. Мархлеўскі, а затым былі паўтораны адкрыта ў заявах СНК і УЦВК. Ленін неаднаразова прызнаваў гэта пасля таго, як адпаведныя захады праваліліся. “Вырашэнне пытання аб Беларусі мы меркавалі не сілай зброі, а выключна толькі шляхам развіцця барацьбы ўнутры Польшчы”, – казаў ён, напрыклад, напачатку кастрычніка 1920 г. [18, с. 320]. Ён жа ясна называў і матыў такой палітыкі: ім была ўпэўненасць у тым, што “рабочыя і сяляне навучыліся самі вырашаць гэтыя граніцы” і што ў выніку іх барацьбы “польскім памешчыкам і капіталістам чужых зямель не ўтрымаць” [18, с. 139]. Такім чынам, пытанне аб Беларусі задоўга да прыняцця рашэння аб аднаўленні БССР было пераўтворана ў сродак савецкай палітыкі на заходнім яе накірунку. Яно не было прынцыповым для савецкага ўрада. Таму, ацэньваючы гэта рашэнне, мы мусім улічваць палітычную кан’юнктуру, якая склалася на момант яго прыняцця – у ліпені 1920 г., а па-другое – усведамляць магчымасць вяртання да палітыкі 1919 – пачатку 1920 г. пры істотным змяненні гэтай кан’юнктуры. Прынцыповым для савецкага ўрада быў толькі погляд на савецкую ўладу ў Расіі як на апору сусветнай рэвалюцыі.

А цяпер пяройдзем да разгляду таго самага рашэння Пленума ЦК РКП(б) ад 16 ліпеня 1920 г., якое прадвясціла другое нараджэнне БССР. Беларускія гісторыкі-класікі ў даследаванні гэтага пытання карысталіся копіяй толькі аднаго фрагмента пратакола рашэнняў Пленума ЦК ад гэтай даты, таго, у якім фіксавалася рашэнне аб стварэнні беларускага рэўкома. Такі падыход не дазваляў убачыць усяго кантэксту, у якім было прынята гэта рашэнне, і правільна зразумець яго значэнне. А яно знаходзілася ў непасрэднай сувязі з прынятым гэтым жа Пленумам прынцыповым рашэннем аб паходзе Чырвонай Арміі ў Польшчу з мэтай яе саветызацыі і перанясення рэвалюцыі ў Германію. Рыхтуючыся да пленума, Ленін, правёў апытанне членаў ЦК і відных польскіх камуністаў з мэтаю высветліць іх меркаванне наконт намераў пасланць Чырвоную Армію ў Польшчу. Адзін з апытаных, член ЦК РКП(б) і Рэўваенсавета Заходняга фронта Івар Смілга ў першым пункце сваёй запіскі ў ЦК прапанаваў: “Абвясціць Беларускую рэспубліку (пакуль in abstracto)” – абстрактна [21, с. 14]. Дадатковую вагу гэтай прапанове надаваў той факт, што Смілга, асоба, блізкая да Леніна, 25 мая 1920 г. рашэннем Палітбюро ЦК быў уведзены ў новы склад Бюро ЦК Кампартыі Літвы і Беларусі і прызначаны яго старшынёй [10, л. 3]. Такім чынам, у час наступлення Чырвонай Арміі на захад праз тэрыторыю Беларусі Смілга быў кіраўніком камуністычнай арганізацыі Літвы і Беларусі, яе куратарам ад ЦК РКП(б) і адначасова сувязным паміж ёю і камандаваннем Заходняга фронта.

Пратакол пленума і зацверджаныя ім тэзісы аб Польшчы сведчаць, што прынятыя рашэнні нацэльвалі партыю на разгортванне сусветнай рэвалюцыі і ставілі ёй на службу рэсурсы савецкай краіны. Першыя пытанні парадку дня былі звязаныя з адкрыццём II кангрэса Камінтэрна, 18-м па ліку стаяла пытанне аб адказе савецкага ўрада на ноту Керзана з яго прапановай аб перамір’і з Польшчай. Да гэтага пункта былі прыкладзены распрацаваныя Леніным тэзісы ЦК, якія прадугледжвалі стварэнне савецкай улады ў Польшчы, і толькі следам ішло пытанне аб стварэнні Беларускага рэўкома – тое самае, рашэнне па якім неаднаразова цытавалася беларускімі гісторыкамі. Тут гаварылася:

ПРЕЗИДЕНТСКАЯ БИБЛИОТЕКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

“Оказать содействие белорусскому народу в создании белорусского ревкома, подчинив на ближайший период времени вопросы организации правительственной власти в пределах Белоруссии военным потребностям фронта” [9, л. 2]. Гэта рашэнне стаяла побач з рашэннямі, абавязваўшымі партыйныя і савецкія органы мабілізаваць польскіх камуністаў на фронт, наладзіць “энергічнае садзеянне” румынскім камуністам, стварыць Галіцыйскі рэвалюцыйны камітэт (Галрэўком) і нават перадаць каштоўнасці і валюту англійскім камуністам, якім належала арганізаваць кампанію салідарнасці з Савецкай Расіяй. Найбольш сакрэтныя з прынятых рашэнняў не трапілі ў машынапісны варыянт пратакола і засталіся ў рукапісе. Адно з іх мела дачыненне да Літвы ў межах савецка-літоўскай ліпеньскай дамовы 1920 г., а значыць і да Беларусі: “Поручить Орбюро [ЦК] оказывать всемерное содействе временной власти в оккупированной части Литвы как работниками, так и деньгами, и проч.” [9, л. 29–29 об.]. У гэтыя дні ў савецкіх кіраўнікоў настолькі закружылася галава ад поспехаў на польскім фронце, што яны пачалі гаварыць не толькі аб саветызацыі Польшчы і Літвы, але і аб падштурхоўванні рэвалюцыі ў Італіі, аб саветызацыі Венгрыі, Чэхіі, Румыніі [14, с. 357; 12, с. 148].

Такім чынам, Беларускай савецкай рэспубліцы, хоць і абстрактнай з пункту гледжання юрыдычнай формы, адводзілася зусім не асбтрактная роля стратэгічнага плацдарму для шырокага наступлення ў Еўропу з мэтай саветызацыі еўрапейскіх краін. Для нарошчвання гэтага наступлення Ленін намагаўся выкарыстаць антыпольскія настроі і адпаведны паўстанцкі рух на акупіраванай тэрыторыі, аб якім ведаў з шэрагу крыніц, у прыватнасці, з данясенняў РВС Заходняга фронта. Аднак з тых жа данясенняў РВС [21, с. 67, 68–69] яму было вядома, што гэты рух суправаджаецца, як гаварылася ў адным з дакументаў, імкненнем да незалежнасці “сярод дробнабуржуазных элементаў”. Улічваючы гэта імкненне, Палітбюро ЦК РКП(б) яшчэ 25 мая ў блоку рашэнняў па беларускіх пытаннях прыняло прапанову Чычэрына пачаць перагаворы з “белым урадам Беларусі” і ўзяло іх на працягу лета, дакладней, імітавала сапраўдныя перагаворы [28]. Такім чынам, рашэнне аб стварэнні Беларускага рэўкома адпавядала як стратэгічным задачам наступлення ў Еўропу, забяспечваючы для яго спрыяльнае прадполле і надзейны тыл, так і палітычным задачам, ствараючы патэнцыяльную супрацьвагу ўраду БНР.

30 ліпеня на пасяджэнні “партыйна-арганізацыйнай тройкі па Мінскай губерні” было разгледжана пытанне “Аб арганізацыі Беларускай рэспублікі”. З пратакола пасяджэння вынікае, што рашэнне аб стварэнні Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта (ВРК) Беларускай савецкай рэспублікі на той момант было ўжо прынята Мінскіма губрэўкомам [13, с. 414–415], а ён, у сваю чаргу, быў створаны Рэўваенсаветам Заходняга фронта напярэдадні ўступлення Чырвонай Арміі ў Мінск [29, с. 68]. Не трэба надта здзіўляцца таму факту, што структура ніжэйшага ўзроўню - губрэўком – стварала рэспубліканскі орган, фармальна атрымаўшы статус вышэйшага органа ўлады на тэрыторыі рэспублікі. Для Мінскага губрэўкома і РВС Заходняга фронта гэта акалічнасць не мела істотнага значэння, паколькі абедзве інстанцыі выконвалі рашэнне сапраўднага органа ўлады - Пленума ЦК РКП(б). У выніку праведзеных ЦК КПЛіБ перагавораў у склад ВРК увайшлі, акрамя літбелаўскіх камуністаў, прадстаўнікі БКА Ігнатоўскі, Бунда Вайнштэйн, а ўзначаліць яго было даручана А. Чарвякову. Намячалася ўключэнне і А. Трафімава ад беларускіх эсэраў, але паколькі эсэры не згадзіліся з тэрытарыяльным абсягам будучай Беларускай рэспублікі, характарам яе ўрада і яе аграрнай палітыкі, то яна 31 ліпеня была абвешчана без іх.

Беларускія гісторыкі ўжо звярталі ўвагу на характар ВРК як часовага надзвычайнага органа ўлады на вызваленай тэрыторыі і на яго асаблівасць як шматпартыйнага органа [30, с. 187], аднак ні з таго, ні з другога факта належных высноў не зрабілі. Што датычыць апошняга – шматпартыйнасці, то яе значэнне нельга перабольшваць. Гэта была абмежаваная і кіруемая бальшавіцкім цэнтрам

З поўным тэкстам дакумента можна азнаеміцца ў бібліятэцы



ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ